Источник: "Краязнаўчая газета" - 2013-02-21

# На тым тыдні…

✓ **6 лютага** дыплом 2-й ступені Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі-2013» атрымала выдавецтва «Тэхналогія» **за кнігу Юрыя Лаўрыка «Кнігі і кнігазборы куцеінскага Богаяўленскага манастыра ў сярэдзіне XVII ст.»**.

Манаграфія распавядае аб выдавецкай і кнігазбіральніцкай дзейнасці брацііі праваслаўнага манастыра ў Куцейні ў найбольш яскравы перыяд яго гісторыі. Выданне здзейсненае дзякуючы фінансавай падтрымцы генеральнага партнёра Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь – кампаніі JTI.

✓ **12 лютага** ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа адбылася **музычна-забаўляльная імпрэза «Вечарына Валянціна»**, прымеркаваная да дня закаханых. Удзельнікам было прапанаванае іранічна-рамантычнае «валянцінаўскае» выступленне студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў з культурнай праграмай «Зорка кахання», выступ фолк-рок гурта «Alta mente» і Кацярыны Ваданосавай, а таксама варажба на лёс і каханне і інш.

✓ **14 лютага** ў Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры правялі **літаратурна-музычную вечарыну «Сустрэў я Вас…»**, дзе госці сустрэліся з вядомым бардам, паэтам, перакладчыкам Алесем Камоцкім, паэткай, лаўрэатам шматлікіх літаратурных конкурсаў і прэмій Людмілай Паўлікавай-Хейдаравай, бардам, мастацкім кіраўніком студэнцкага тэатра «Жывое слова» Алесяй Сівохінай.

✓ **З 14 па 16 лютага** ў Інстытуце імя Гётэ адбыўся **Другі міжнародны паэтычны фестываль «Вершы на асфальце»**, прысвечаны памяці Міхася Стральцова. Арганізатарамі выступілі Саюз беларускіх пісьменнікаў, Беларускі ПЭН-цэнтр, Інстытут імя Гётэ ў Мінску, а таксама Шведскі саюз пісьменнікаў. Сярод замежных удзельнікаў былі паэты з Германіі, Літвы, Расіі, Украіны, Швецыі, Эстоніі. Праграму фестывалю склалі міжнародны паэтычны слэм, традыцыйныя паэтычныя чытанні, а таксама некалькі прэзентацыяў, у тым ліку кніжных серый «Кнігарня пісьменніка» і «Пункт адліку», узнагароджанне пераможцаў конкурсу імя Максіма Танка.

✓ **15 лютага** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі ў рамках святкавання 20-годдзя ўсталявання дыпламатычных адносінаў паміж Рэспублікай Беларусь і Азербайджанскай Рэспублікай адбылася **прэзентацыя мініяцюрнага выдання Янкі Купалы «Жалейка»** і перадача яго ў дар НББ.




Двухтомнік пабачыў свет у выдавецтве «Indigo» (г. Баку). Стваральнікам беларускамоўнага выдання з'яўляецца старшыня Азербайджанскага таварыства «Кніга», дырэктар бакінскага Музея мініяцюрных кніг Зарыфа Салахава.

✓ **18 лютага** ў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі прэзентавалі выстаўку **«Браму скарбаў сваіх адчыняю …»**, прысвечаную 120-годдзю з дня нараджэння вядомага беларускага пісьменніка, публіцыста, вучонага, педагога Максіма Гарэцкага. Юбілейная экспазіцыя, падрыхтаваная на аснове шматлікіх архіўных матэрыялаў і друкаваных дакументаў з фонду аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў, распавядае пра жыццё вы і творчы шлях выдатнага творцы. Сярод экспанатаў – арыгіналы рукапісаў пісьменніка, у тым ліку першыя спробы пяра, датаваныя 1912 г., рукапіс «Камароўскай хронікі», пераклад на рускую мову «Віленскіх камунараў», шматлікія занатоўкі, накіды, незавершаныя творы, іншыя творчыя матэрыялы, а таксама фальклорныя запісы. Экспазіцыя ўключае дакументы да біяграфіі пісьменніка, цікавыя фатаграфіі як самога М. Гарэцкага, так і яго бацькоў, здымкі з братамі Іванам і Гаўрылам, з жонкай Л. Чарняўскай-Гарэцкай, дзецьмі і інш.